Княства Літоўскага, іх прадажнасць і антыдзяржаўнасць; па-другое, высмеяў псеўдапатрыятызм і прыхільнасць шляхты да ідэалогіі сарматызму, які з'яўляўся «ідэалагічным абгрунтаваннем дзяржаўнай уніі Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, а пасля 1569 г. – існавання шматнацыянальнай і шматканфесійнай Рэчы Паспалітай» [4, с. 552]; па-трэцяе, у вобразе Мялешкі высмеяў неадукаванасць, самаўпэўненасць, паказаўшы яго няўменне прыгожа выказваць свае думкі, яго паказную традыцыйнасць, пыхлівасць, ліслівасць у адносінах да караля. Аўтар з іроніяй выяўляе патрыятызм Мялешкі, абмежаваны магчымасцю застацца сярод іншых сенатараў пры хоць і невялікай, але ўладзе, і пашырыць свае ўладанні з дапамогай каралеўскага зямельнага надзелу. Таму праз вобраз смаленскага кашталяна робіцца зразумелай трагедыя не толькі аўтара, але і ўсёй краіны, якая апынулася ў руках іншаземцаў і суайчыннікаў, што дбаюць выключна пра сябе і свае выгоды. Насельнікі ж Вялікага Княства Літоўскага з прычыны палітычных гульняў вышэйшых чыноў Рэчы Паспалітай не здольныя пачувацца гаспадарамі на сваёй зямлі і могуць толькі спадзявацца на іх літасць.

**Літаратура**


1. Лазука, Б. А. Беларускае барока : Гісторыка-тэарэтычныя праблемы стылю / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2001. – 144 с.
2. Мальдзіс, А. На скрыжаванні славянскіх традыцый / А. Мальдзіс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 352 с.
3. Мальдзіс, А. В. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі / А. В. Мальдзіс // Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі : эсэ ; Восень пасярод вясны : аповесць, сатканая з гістарычных матэрыялаў і мясцовых паданняў. – Мінск, 2001. – С. 3–268.
4. Пазднякоў, В. Сарматызм / В. Пазднякоў // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 552–553.
5. Саверчанка, І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока / І. Саверчанка. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 319 с.
6. Wiszniewski, M. Jкzyk i literatura biaioruska / M. Wiszniewski // Historya literatury polskiej. – Krakyw : W drukarni Uniwersiteckiej, 1851. – T. 8. – S. 480–484.



*В. В. Круглова (Беларусь)*


## АСЭНСАВАННЕ РОЛІ ПАЭЗІІ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ ЛУЧЫНЫ І МАКСІМА ТАНКА

Янка Лучына тварыў на мяжы эпох рамантызму і рэалізму (пазітывізму), рысы якіх увасобілся ў яго творчасці. Спадчына Максіма Танка належыць пераважна да мадэрнізму. Аднак шмат агульнага ёсць у лірыцы прадстаўнікоў розных напрамкаў. У цэнтры ўвагі пісьменнікаў знаходзіліся чалавек, праца, радзіма, прырода. Абодва паэты ў большай ці меншай ступені звярталіся да агульных мастацкіх, сацыяльных, грамадскіх праблем. Янку Лучыну і Максіма Танка, як і многіх пісьменнікаў, цікавіла прызначэнне мастацтва.

Мастацтва – своеасаблівая форма светасузірання. Менавіта мастацкія творы з'яўляюцца найбольш выразным выказванне поглядаў аўтара на свет. Мастацтва адрозніваецца ад філасофіі, рэлігіі, навукі тым, што ў ім асноўным сродкам пазнання з'яўляецца вобраз. Вобразны характар мастацтва выявіў Г. В. Ф. Гегель: «Форма пачуццёвага сузірання ўласціва мастацтву. Менавіта мастацтва даводзіць да свядомасці ісціну ў выглядзе пачуццёвага вобраза, і пры гэтым такога пачуццёвага вобраза, які ў самай сваёй з'яве мае вышэйшы, больш глыбокі сэнс і значэнне» [3, с. 127].

Істотнай рысай літаратуры рамантызму, якая знайшла ўвасабленне ў творчасці Янкі Лучыны, з'яўляецца зварот да тэмы мастацтва, асэнсаванне

яго ролі ў жыцці грамадства. Паэт у пэўным сэнсе выступае як тэарэтык літаратуры і мастацтва, ускосна выказваючы меркаванне аб тым, што мастацтва здольна звярнуць увагу на актуальныя жыццёвыя пытанні і аб’яднаць людзей для іх вырашэння. Для Янкі Лучыны творчасць не толькі з’яўляецца выражэннем праблем народа, але таксама служыць сродкам для разумення жыцця ніжэйшых слаёў, спосабам пранікнення ў псіхалогію сялян. Падобны погляд уласцівы М. Бораву: «Мастацтва ў духоўна-практычным, а эстэтыка ў тэарэтычным плане засяроджваюць увагу на агульначалавечым, яны актуальныя, бо спрыяюць зближэнню людзей, у якіх без пагаджэння ў свеце няма будучыні. Эстэтыка і мастацтва – фокус усёй сусветнай культуры і сканцэнтраванне гуманітарнага вопыту чалавецтва» [2, с. 14].

Лірычныя творы паэта ўяўляюць сабой паказ штодзённагя жыцця простага чалавека, тым самым набліжаючы прадстаўнікоў шляхты да спасціжэння народнай мудрасці. Г. В. Ф. Гегель адзначыў ролю мастацтва ў набліжэнні да народа: «У творы мастацтва народы ўклалі свае самыя змястоўныя ўнутраныя сузіранні і ўяўленні, мастацтва часта служыць ключом, а ў некаторых народаў адзіным ключом, для разумення іх мудрасці і рэлігіі» [3, с. 32].

Янка Лучына ўсведамляў той факт, што творчасць абавязкова павінна быць звязана з жыццём Айчыны і землякоў, адлюстоўваць кожны бок жыцця народа. Г. Паспелаў акрэсліў сувязь творчасці з жыццём грамадства: «…прадметам мастацтва можа стаць толькі тое, што звязана так ці інакш з сацыяльным жыццём людзей. Гэта перш за ўсё самі людзі ў матэрыяльным і духоўным баках іх сацыяльных адносінаў. Гэта ўсё тое ў жыцці людзей, у іх дзеяннях, думках, перажываннях, складзе іх жыцця, акаляючай іх абстаноўцы…» [5, с. 83].

На думку пісьменніка, мэта паэзіі праяўляецца ў тым, каб служыць радзіме і народу, накіроўваць на правільны шлях развіцця, пашыраць асвету, прамаўляць у вершах ад імя народа:

Hej! lirniku, hej młody! – idź z twą bracią w zawody
Wieści braciom daj chyże! [1, s. 72]
(«Lirnik wioskowy»)

Святая истина – забота
И цель его печатных строк.
Служить стране, глухой, забитой,
Где мрак невежества царит… [4, с. 124]
(«Не ради славы иль расчёта…»)

У творчасці Янкі Лучыны прысутнічае вобраз лірніка-прарока, абранага Богам, характэрнага для эпохі рамантызму. Пісьменнік надзяляе яго выключнай місіяй – пасрэдніка паміж Богам і людзьмі, які павінен усведамляць сябе часткай грамадства, сваёй песняй выклікаць цікавасць да праблем грамадства і не даваць магчымасці прынізіць сябе і свой народ:

Liro! słowem ojczystem, pieniem dla nas graj czystem
Głośniej, niż dzwonów spiże!
A ty, komu Bóg we śnie czarodziejskie szle pieśni,
Skonaj, grając na lirze! [1, s. 73]
(«Lirnik wioskowy» Янка Лучына)

Вобраз лірніка прысутнічае ў творчасці Максіма Танка, які надзяліў яго выключнымі здольнасцямі, які падарыў кожнай істоце на зямлі частку сваёй творчасці, сваіх пачуццяў:

Аддаў струны зорам,
Сум – вербам, калінам,

А радасць – азёрам,
А рэха – далінам [6, с. 31].
(«Лірнік»)

Паэт уяўляецца Максіму Танку пасрэднікам паміж чалавекам і Сусветам. У лірыцы пісьменніка паэт паўстае як выключная асоба, надзеленая асаблівым дарам, што разумее жывёлаў і раслін, а яго душа і сэрца адкрыты ўсяму свету:

Бо як бы да яго
Маглі ўсе залятаць вятры,
Усе птушкі, зоры,
Заходзіць усе дрэвы,
Кветкі, людзі,
З якімі ён дружыў [6, с. 245].
(«Паказваюць дом паэта…»)

У паэзіі Янкі Лучыны гучыць матыў еднасці і непарыўнасці лірычнага героя і песні. Гэта еднасць дастаткова ярка праяўляецца. Можна разглядаць асобу паэта і яго песню як духоўнае цэлае, аднаго непадзельнага героя:

I czemuż? czemuż wcześniej nie wiedziałem,
Żeś ty, piosenko, dla mnie przeznaczona?
Że twoje tony będzie mym udziałem
Snuć z mego łona! [1, s. 145]
(«Czarne myśli»)

Нават у назве верша «Z dziejów życia i pieśni» заключана ідэя аб тым, што для Янкі Лучыны жыццё і песня непадзельныя, яны вынікаюць адно з аднаго і не могуць існаваць асобна.

Для Максіма Танка паэзія – гэта ўвасабленне жыццёвых радасцей. Яна паўстае як праваднік у жыцці. Паэт адухаўляе паэзію, сцвярджаючы немагчымасць існавання без яе:

Я ведаў, што ты бліскавіца,
Што хмары рассекла;
Я ведаў, што ты – вызваленне,
З няволі і пекла… [6, с. 83]
(«Паэзія»)

Янка Лучына заклікае творцаў пісаць шчырыя вершы, прыслухоўвацца да свайго ўнутранага голасу. Паэт выказвае надзею і спадзяванне на тое, што, дзякуючы трапным, праўдзівым вершам, паэзія прынясе карысць, абудзіць цікавасць шырокага кола людзей да свету мастацтва. Янка Лучына выступае супраць безідэйнай паэзіі:

Budź dumy, co smucą:
Niech w piersiach zanuc
Pieśń wzniosłą! Niech wzlata
Myśl w piękny kraj świata… [1, s. 134]
(«Do poety»)

Паводле Янкі Лучыны, задача паэта заключаецца ў тым, каб слухаць і даследаваць чалавечую душу, а таксама ўплываць на яе праз творчасць:

Chciałbym myśl ludzką śledzić w rozwoju,
Zbadać jej każdą zwrotkę odmienną! [1, s. 145]
(«Czarne myśli» Янка Лучына)

Максім Танк праводзіць паралель паміж пляценнем кошыка і пісаннем вершаў, але спыняецца на словах: А што ўжо казаць, // Як плясці трэба // Вершы! [7, с. 5] («Пляцэнне кошыка»), нібы паказваючы, што напісанне мастацкіх твораў настолькі складаная задача, што не паддаецца апісанню.

Паэзія для Максіма Танка неўміручая, што ён гатовы сцвярджаць нягледзячы на тое, што яго думку не ўсе раздзяляюць:

– У якой імперыі
Не заходзіла сонца?
Я адказаў: – Толькі ў адной –
У імперыі паэзіі… [6, с. 233]
(«На экзамене»)

Лірычная творчасць Янкі Лучыны і Максіма Танка – гэта гісторыя жыцця беларускага народа, праўдзівае адлюстраванне яго лёсу на пэўным гістарычным этапе. Іх паэзія – узор грунтоўнага, удумлівага стаўлення да творчасці. Янка Лучына і Максім Танк дбалі аб тым, каб кожная страфа іх верша была напоўнена зместам з гісторыі Айчыны. Ф. В. Й. Шэлінг выразіў ідэю аб пабудове творчасці на праўдзівым гістарычным матэрыяле: «…паэзія для ўсяго роду чалавечага і павінна будавацца, так сказаць, з Матэрыялу ўсёй гісторыі апошняга з усімі яе разнастайнымі фарбамі і гукамі…» [8, с. 145]. Абодва творцы выразілі веру ў тое, што іх творчасць дасягне пастаўленай мэты – служыць чалавеку.

**Літаратура**


1. Niesłuchowski, J. Poezje / J. Niesłuchowski. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1898. – [8], 155, [4] s.
2. Борев, Ю. Эстетика : учебник / Ю. Борев. – М. : Высш. шк., 2002. – 511 с.
3. Гегель, Г. В. Ф. Эстетика : в 4 т. / Г. В. Ф. Гегель ; под ред. и с предисл. М. Лифшица. – М. : Искусство, 1968–1973. – Т. 1 / пер. Б. Г. Столпнера. – 1968. – XVI, 312 с.
4. Лучына, Я. Творы : вершы, нарысы, пер., лісты / Я. Лучына ; уклад., прадм. і камент. У. Мархеля. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 206 с.
5. Поспелов, Г. Н. О природе искусства / Г. Н. Поспелов. – М. : Искусство, 1960. – 204 с.
6. Танк, М. Выбранае : Вершы / Прадм. В. Зуёнка ; – Мінск : Маст. літ., 1993. – 335 с.
7. Танк, М. Мой каўчэг : Вершы. 1989 – 1992 / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 207 с.
8. Шеллинг, Ф. В. Философия искусства / Ф. В. Шеллинг ; пер. П. С. Попова ; под общ. ред. М. Ф. Овсянникова. – СПб. : Алетейя : Унив. кн., 1996. – 496 с.


*И. П. Кудреватых (Беларусь)*

## АССОЦИАТИВНЫЙ ПОТЕНЦИАЛ СМЫСЛОВОЙ СТРУКТУРЫ ПОЭЗИИ И. БРОДСКОГО

Коммуникативная лингвистика и различные ее направления (дискурсивная семантика, процессуальная семантика, коммуникативный синтаксис, контекстная лингвистика, лингвистика текста, прагмалингвистика и др. – одна из основных научных парадигм современного языкознания, поскольку лингвистика не ограничивается сегодня описанием отдельных языковых единиц в аспекте парадигматики, а стремится проникнуть в глубь семантики языка на уровне речи, текста. Основными особенностями коммуникативной лингвистики являются «анализ языковых единиц в условиях конкретных коммуникативных актов и рассмотрение высказывания (текста) как отправного звена анализа языка» [3, с. 6].

Комплексное изучение художественного текста, связанное с формированием новой парадигмы научного знания – коммуникативной стилистики художественного текста, характеризует новое направление современной функциональной стилистики. Возникшая на стыке с другими науками, коммуникативная стилистика художественного текста рассматривает текст как форму коммуникации, т.е. как речевое образование, устанавливающее своеобразное сотворчество автора и читателя. В связи с интенсивным развитием коммуникативной лингвистики особую актуальность приобретает изучение языковых